Аляксандраў У. Л. Пераадоленне міжрэлігійных супярэчнасцяў: погляд Данііла Андрэева

Жыццё і творчасць паэта і мысляра Данііла Андрэева прыйшліся на трагічны перыяд рускай і сусветнай гісторыі. Дзяцінства і юнацтва супалі з кастрычніцкай рэвалюцыяй і грамадзянскай вайной. Сталенне як асобы і творцы адбывалася ў гады фарміравання і ўмацавання сталінскага рэжыму.

Данііл Андрэеў нават у часы ваяўнічай атэістычнай палітыкі савецкай дзяржавы не баяўся адкрыта спавядаць сваю адданасць праваслаўнай веры, наведваў набажэнствы ў дзеючых храмах, якіх з гадамі ў Маскве і іншых гарадах заставалася ўсё меней. Яго паэтычная творчасць насіла выразна рэлігійны характар, таму не было і размовы аб магчымасці публікацый у савецкім друку.

Кульмінацыяй драматычнага жыццёвага шляху паэта стаў арышт у 1947 годзе па сфабрыкаванай па тагачаснай завядзёнцы справе аб падрыхтоўцы замаху на Сталіна і прысуд – 25 год турэмнага зняволення. Нялёгкае выпрабаванне апынулася нечаканай творчай лабараторыяй неверагоднай моцы і глыбіні. Менавіта ў турме былі створаны і цудам захаваліся галоўныя творы: вершы, паэмы і вядомы трактат «Ружа свету». Апублікаваны пасля смерці аўтара, напрыканцы савецкай эпохі, ён выклікаў вялікі рэзананс і шмат спрэчак, каментароў, інтэрпрэтацый. Гэты твор унікальны як па сваім змесце, так і па форме. Апошняя ўяўляе сабой сінтэз дзясятка розных літаратурных жанраў. Змест жа прысвечаны, па-першае, апісанню структуры сусвету, аналагічнай дантаўскім «падарожжам» па «колах раю і пекла», але значна больш глыбокім, разнастайным і сістэматызаваным, а па-другое, апісанню метагістарычных працэсаў, якія вынікаюць з унутранай сутнаснай сувязі розных слаёў (вымярэнняў) Зямлі. І тыя, і другія веды Д. Андрэеў, калі верыць яго сведчанням, атрымаў праз містычны досвед дзякуючы прыадчыненасці органаў духоўнага ўспрымання.

У нашых тэзісах з вялікай і разнастайнай яго спадчыны мы возьмем толькі адзін аспект – тэму міжрэлігійнага дыялогу, пераадолення канфліктаў паміж канфесіямі. Актуальнасць гэтай тэмы відавочна менавіта ў нашы дні, калі глабалізацыйныя працэсы рэзка абвастрылі міжрэлігійныя і міжкультурныя адносіны.

Данііл Андрэеў яшчэ ў сярэдзіне 50-х гадоў прагназаваў глабалізацыю і востра адчуваў як яе магчымасці, так і праблемы, як станоўчыя, так і адмоўныя бакі. Сама глабалізацыя была для яго непазбежнай з-за ўнутранага ўласцівага чалавеку «памкнення да сусветнга». Гэты імпульс знаходзіць сваё адлюстраванне ў эканоміцы, палітыцы, навуцы і тэхніцы.

Але ў культурным будаўніцтве Д. Андрэеў бачыць больш складаную, дыялектычную карціну: паводле яго гісторыя і метагісторыя ёсць працэс станаўлення і развіцця адносна самастойных, але ўзаемазвязаных культур і метакультур (агульнай колькасцю 34), якія толькі ў сучаснасці павінны дапоўніцца нейкай агульначалавечай культурай. Яна ж у сваю чаргу не павінна адмяняць ці падаўляць метакультуры. Многія чытачы «Ружы свету» рэзка крытыкавалі менавіта гэту ідэю як утапічную, неажыццяўляльную ў прынцыпе. Сапраўды, калі ёсць у сучасным свеце нейкая глабальная культура, то гэта культура масавая. А яна па вызначэнні нясе з сабой сярэднія і нізкія стандарты якасці і, акрамя таго, відавочна выцясняе на перыферыю ці адпраўляе ў нябыт нацыянальныя культуры.

Найбольш востра гэты канфлікт праяўляецца як раз у рэлігійнай сферы. Д. Андрэеў марыў пра ўзнікненне нейкай інтэррэлігіі (якую і называў «Ружай свету»), якая, з аднаго боку, павінна

прапанаваць новую, больш багатую і адпаведную часу дагматыку, а з іншага, указаць такі сінтэтычны погляд на папярэднія рэлігіі, які дазволіць ім самім, захоўваючы вернасць сваім прынцыпам і ідэям, пераадолець канфрантацыйнае стаўленне да ідэяў іншых веравызнанняў.

Ці магчыма гэта ў прынцыпе, ці не ёсць яшчэ адной  з праяваў утапізму, у якім так часта абвінавачваюць паэта? Сам Д. Андрэеў лічыў, што гэта не толькі магчыма, але і неабходна. Для гэтага перш за ўсё трэба вылучыць сапраўдныя прычыны рэлігійных рознагалоссяў, а потым намеціць шляхі іх пераадолення. Паводле Д. Андрэева галоўных прычын дагматычных і нарматыўных разыходжанняў паміж рэлігіямі дзве: «па-першае…у сілу розных ступеняў свайго ўзыходжання да абсалютнай ісціны…па-другое…у сілу таго, што яны гавораць аб розным, адлюстроўваюць розныя шэрагі аб’ектаў пазнання»[1, с. 24].

Гэта азначае, што, з аднаго боку, ёсць нейкая агульная лінія рэлігійнага прагрэсу, паводле якой можна супастаўляць рэлігійныя догмы як адпавядаючыя ў рознай ступені трансцэндэнтнай (у тэрміналогіі аўтара – трансфізічнай) рэчаіснасці.Але ў той жа час Д. Андрэеў падкрэслівае, што сама трансфізічная рэчаіснасць не аднамерная і не нерухомая: яна «поўная кіпучага руху, аб яе статыцы не можа быць і гаворкі» [1, с. 52]. З гэтага вынікае, што калі пэўная рэлігія адэкватна адлюстроўвае нейкую частку гэтай рэчаіснасці, то іншыя рэлігіі не павінны абвяшчаць яе сцверджанні памылковымі толькі на падставе адсутнасці аналагічных ідэй у сябе. Скажам, паводле Д. Андрэева ўзнікненне ідэі вымярэнняў з часовымі, а не вечнымі пакутамі (так званых чысцецаў ці шэолаў) было абумоўлена тым, што ў адных метакультурах яны сапраўды ўзніклі ў пэўны момант намаганнямі правідэнцыяльных сілаў, а ў іншых у той жа час – яшчэ не. Таму ў сярэднявеччы мелі рацыю і каталікі, якія пачалі верыць у існаванне такіх слаёў, і праваслаўныя, якія іх адмаўлялі. Але калі такія слаі ўзніклі ў праваслаўных метакультурах, а  дагматыка па-ранейшаму напалягае на іх немагчымасці, то такі кансерватызм становіцца тормазам на шляху рэлігійнага пазнання і маральнага развіцця, замацоўвае памылковыя погляды, наносячы шкоду вернікам сваёй канфесіі. Да такіх адназначна памылковых ідэй Д. Андрэеў адносіць, у прыватнасці, прыпісванне Богу вобразу жорсткага, бязлітаснага суддзі і ката, а таксама прыпісванне Богу адказнасці за ўзнікненне ў нашым свеце законаў смерці, барацьбы за існаванне (узаемапаядання) і пакутаў, у тым ліку – пасмяротных. Тады духоўныя аўтарытэты канкрэтнай канфесіі нясуць маральную і кармічную адказнасць за ўпартае і працяглае ўкараненне ў масавую свядомасць вернікаў такіх памылковых ідэй. Дастаткова прывесці прыклад рэлігійнага  сучаснага фанатызму і экстрэмізму, калі тэрарысты шчыра ідуць на самагубства і забойства невядомых ім, ні ў чым не вінаватых людзей, з глыбокім перакананнем у справядлівасці  і апраўданасці сваіх жудасных учынкаў, нават спадзяючыся на замагільнае ўзнагароджанне і пашану.

Ёсць і яшчэ адна прычына, якая паводле Д. Андрэева перашкаджае рэлігійнаму дыялогу і ўзаемапаразуменню. Яна як ні дзіўна караніцца не ў самой рэлігіі, а ў навуцы, дакладней – у фармальнай логіцы. Як вядома, класічная (традыцыйная, арыстоцелеўская) логіка двухзначная. Яна татальна панавала ў перыяд класікі – філасофскай, навуковай, агульнакультурнай. Менавіта яна перашкаджала і перашкаджае дапусціць, што няма непераадольнай супярэчнасці паміж монатэізмам і політэізмам; паміж адзіным непаўторным жыццём індывіда і рэінкарнацыяй (пераўвасабленнем); паміж самазахаваннем асобы і растварэннем яе ў боскай прыродзе; паміж тэізмам і пантэізмам; паміж крэацыянізмам і ідэяй эманацыі; крэацыянізмам і ідэяй эвалюцыі; паміж адзінасцю Бога і яго траічнасцю; паміж іконаборчаствам і іконашанаваннем; паміж культам святых і яго адмаўленнем; паміж вечнасцю і часовасцю пакут і многімі сотнямі іншых «паміж».

Д. Андрэеў разглядае некалькі такіх разыходжанняў, асабліва падрабязна – канфлікт вернікаў монатэістычных і політэістычных рэлігій і канфлікт паміж верамі ў адзінкавасць ці мноства інкарнацый. На падставе асабістага містычнага досведу і ў той жа час глыбокага рацыянальнага, але некласічнага аналізу ён паказвае, што для зняцця такіх псеўдасупярэчнасцяў «не патрабуецца нічога, акрамя адмовы кожнага з бакоў ад прэтэнзій на ўніверсальную выключнасць сваёй ідэі»[1, с. 25].

У якасці ўзору рэлігійнай свядомасці новага тыпу на нацыянальна-культурным узроўні Д. Андрэеў прыводзіць прыклад сучасных японцаў: «сінкрэтызм японцаў, то бок адначасовае спавяданне імі шынтаізму і каталіцтва, шынтаізму і будызму, ёсць не псіхалагічны парадокс, а, наадварот, першы намёк на тое, як павінны дапаўняць гарманічна адно адно досведы і ісціны розных рэлігій»[1, с. 29].

Гэты прыклад дэманструе, што падобная ўстаноўка не ёсць асабістай ілюзіяй, утапічнай марай аднаго, хаця і таленавітага, творцы. У той жа час крытыкам падобнага сінтэзу варта задумацца: а што выступае яму альтэрнатывай у сучасным глабалізаваным свеце? Пры захаванні кансерватыўных, ультраартадаксальных, нецярпімых да іншых поглядаў і ідэй аб'яднаны свет, «Ноеў каўчэг» сучаснасці, можа весці толькі да росту фанатызму, экстрэмізму, тэрарызму, у тым ліку на рэлігійнай глебе. Менавіта гэта больш за паўстагоддзя таму вострa прадчуваў і імкнуўся сваёй творчасцю  прадухіліць паэт і містык Данііл Андрэеў.

Літаратура

1.Андреев Д. Л. Роза мира. Метафилософия истории / Д. Л. Андреев. – М.,1991.